**Міцуль Н.Я.,**
аспірантка кафедры
беларускай і сусветнай культуры

# РАЗВІЦЦЁ ЦЫМБАЛАЎ НА БЕЛАРУСІ Ў СТАРАЖЫТНЫ ЧАС

Цымбалы займаюць значнае месца ў музычнай культуры славян. Вось вытрымкі з чатырох Азбукоўнікаў XVI—XVII стст., якія раскрываюць ужыванне цымбалаў у славянскіх народаў:

1. Лексікон славенароскі, складзены Берындою (першае друкаванне 1627 г.) = Брацала, бразгальца, тое што бразчыць, як кляпала; цытра, фістула ў арганаў, цымбалаў, арфаў.

2. Алфавіт речей іностранных (канца XVII ст., сабраны Салаўёвым, № 12) = Гудзенне — Іграннe ў гуслі, у домры, у цымбалы...

3. Кніга, глаголемая Алфавит иностранных речей (1596 г.) = Музікія, гудзенне ў гуслі, у цымбалы...

4. Алфавит речей иностранных (конец XVII ст.) = Музікія: ігранне ў цымбалы...

Дачыненне да заходнееўрапейскай цымбальнай музыкі на Беларусі ў значнай ступені забяспечвалася некалькімі фактамі.

Н.Гумянюк выказвае меркаванне, што цымбалы на Беларусь былі завезены нямецкімі феадаламі ў XII—XIII стст. Рыцары Тэўтонскага ордэна ў 1237 г. захапілі беларускае м. Дарагічын. У нямецкім войску былі музыканты, спевакі, дэкламатары, якіх называлі мінезінгерамі. Магчыма, яны занеслі на беларускія землі старажытны цымбалападобны інструмент, які прыжыўся, быў мадэрнізаваны беларускім народам і стаў яго нацыянальным інструментам.

Маглі завезці яго на беларускія землі і вандроўныя музыканты-скамарохі. Найбольш раннія вядомыя вобразы музыкаў адносяцца да XIII ст. Сярод іх былі гусляры,

дудары, бубначы, лудачнікі, пазней з'явіліся скрыпачы, цымбалісты. Яны ўдзельнічалі ў княжацкіх застоллях, народных гульнях.

Беларусь ніколі не мела абмежаванняў для пасялення на яе тэрыторыі людзей іншых нацыянальнасцей. Так, у XIV ст. з Германіі і Польшчы сяліліся цыганы, яўрэі, у якіх цымбалы былі ўлюбёным інструментам. У час масавых ганенняў на рэлігійнай глебе на Беларусь з краін Еўропы траплялі бежанцы: літоўцы, украінцы, палякі, татары, немцы, якія не маглі не накласці свайго адбітку на беларускую культуру.

Беларуская моладзь, што вучылася ва універсітэтах Кракава, Прагі, Кёнігсберга, Лейпцыга, Базеля, Падуі і іншых еўрапейскіх гарадоў, таксама магла прывезці цымбалы на Беларусь. У 1385 г. адбылося падпісанне Крэўскай уніі, якая пашырыла культурныя сувязі беларускай народнасці з польскай. Праз тэрыторыю Польшчы ў краіны Заходняй Еўропы бесперашкодна ездзілі беларускія вучоныя і асветнікі. Цымбалы з'явіліся ў Польшчы, як сцвярджаюць польскія вучоныя, у II ст.

У Вялікае княства Літоўскае везлі з Еўропы розныя рамесныя вырабы і заморскія тавары купцы, а цымбалы ў сярэдневяковай Еўропе былі вельмі распаўсюджаны і карысталіся вялікім попытам.

Важную ролю ў распаўсюджанасці цымбалаў на Беларусі адыгрывала батлейка. Абавязковае музычнае суправаджэнне спектакляў рабіла гэтыя відовішчы сінтэтычнымі па сваім характары. Першая частка пастаноўкі суправаджалася спевамі духоўных вершаў, якія выконваў хор, другая частка — інструментальным ансамблем у складзе скрыпкі, цымбалаў, дуды ці бубна. У канцы 1899 г. у Магілёўскай і Віцебскай губернях існавала батлейка, з якой хадзілі па гарадах Магілёве, Суражы, мястэчку Прапойску, сяле Бычы Быхаўскага павета і па навакольных вёсках. Фальклорны матэрыял з уласцівай яму сатырай дапаўняўся народнымі інструментамі: цымбаламі і скрыпкай.

Репозиторий БГУКИ

У XVII ст. музыка займае ўсё больш значнае месца ў побыце дваран, магнатаў. У першай палове XVIII ст. на Беларусі набылі папулярнасць самыя розныя капэлы — як вакальна-інструментальныя, так і ўласна інструментальныя. Так, у рэзідэнцыю мінскага ваяводы, мемуарыста Кшыштафа Завішы была выклікана капэла цымбалістаў з Мінска. Ён пісаў: "У мяне была велізарная музычная капэла цымбалістаў з Мінска, рэзалі добра старасвецкія танцулькі". У мемуарнай літаратуры XVIII ст. знаходзім, што "пасля вячэры кароль Радзівіл паехаў у горад і там загадаў склікаць гарадскіх музыкантаў са скрыпкамі і цымбаламі".

З цягам часу цымбалы моцна ўвайшлі ў побыт беларускага народа, сталі неад'емным атрыбутам жыцця многіх беларускіх сёл. На жаль, некаторыя каштоўныя тэндэнцыі, якія вызначыліся ў цымбальнай народнай творчасці да Кастрычніцкай рэвалюцыі, не атрымалі ў той перыяд належнай рэалізацыі. І тым не менш менавіта тыя каштоўныя якасці, што сфарміраваліся ў беларускім цымбальным мастацтве ў ранейшы час, леглі ў аснову станаўлення беларускага сучаснага цымбальнага мастацтва. Менавіта на іх базе беларускае нацыянальнае выкананне зрабіла свае першыя крокі.

Пакуль што мы мала ведаем аб першых беларускіх цымбалістах. Гэтыя сціплыя звесткі даюць магчымасць выказаць меркаванне аб наяўнасці развітай цымбальнай культуры ў тыя далёкія гады.

Які б ні быў цікавы і важны факт вызначэння прыярытэту ў стварэнні інструмента або высвятлення таго, якому народу належыць яго вынаходства, важнейшая тая роля, што інструмент выконвае ў музычным мастацтве народа. Такое становішча займаюць цымбалы ў культуры Беларусі. У наш час яны сталі масавым інструментам, выконваючы вельмі значную ролю, становячыся любімым нацыянальным інструментам.

Рэпазіторый БДУКІ